**2 (187)**

**ЛЮТЫ**

**Выдаецца са студзеня 1993 г.**

*Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1221 ад 14 студзеня 2013 г.*

**Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)**

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

**НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС**

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Пачатковая школа», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч*

***Рэдакцыйная калегія:***
**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***
**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

***Рэдакцыя:***
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактар аддзела — **Надзея Кушнер**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Людміла Шчэрба**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі 3

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Аляксандр Груша — Скарбніца навуковых ведаў *(да 90-годдзя Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі)* 5

Алена Цітавец, Вольга Губанава — Кірылічныя выданні XVI—XVIII стст. у зборах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі 7

ЗНАХОДКІ І АДКРЫЦЦІ

Галіна Флікоп — Абраз "Святая Сям'я" з Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь: іканаграфія твора і яго лёс 10

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Аляксандр Гужалоўскі — Мікалай Улашчык — аматар і знаўца музейнай справы 21




*Увазе чытачоў прапаноўваюцца матэрыялы новай рубрыкі "Даследчая лабараторыя настаўніка". У гэтай рубрыцы рэдакцыя будзе змяшчаць артыкулы навукоўцаў, метадыстаў, настаўнікаў-практыкаў па актуальных пытаннях рэалізацыі адной з задач адукацыйнага працэсу — фарміраванння навыкаў даследчай дзейнасці ў школьнікаў. Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва педагогаў падзяліцца сваімі напрацоўкамі, прапановамі, рэкамендацыямі з чытачамі нашага часопіса. Адкрывае рубрыку матэрыял Аляксандра Корзюка. У ім вызначаны асноўныя накірункі для рэалізацыі прафесіянальных якасцяў педагогаў па арганізацыі даследчай дзейнасці ў адукацыйным працэсе.*

**Аляксандр КОРЗЮК**

# ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ
## як неабходная ўмова работы педагога

*У работу ўстаноў адукацыі ўкараняюцца розныя новаўвядзенні, якія патрабуюць змяненняў у арганізацыі і змесце адукацыйнага працэсу ў цэлым. У адпаведнасці з гэтым растуць і патрабаванні да педагога, які павінен працаваць у рэжыме пастаяннага развіцця і ўдасканалення свайго прафесійнага майстэрства.*

У сучасным грамадстве шмат у чым змянілася разуменне мэтаў, фактараў і механізмаў адукацыі як сацыяльнага інстытута, які вызначае працэс станаўлення і ўдасканалення асобы. Паступова школа робіцца шматфункцыянальнай сацыякультурнай установай. У сувязі з гэтым да традыцыйных функцый настаўніка дадаецца шэраг новых, у тым ліку культуразберагальная функцыя, функцыя сацыяльнай абароны, здароўезберагальная і інш. Усё гэта прывяло да неабходнасці рэалізацыі *кампетэнтнаснага падыходу* ў адукацыі, што прадугледжвае, у прыватнасці, дастаткова высокі ўзровень ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці і дасягненне высокіх вынікаў навучання і выхавання вучняў. Пры гэтым кампетэнтнасць настаўніка вызначаец-



***КОРЗЮК Аляксандр Аляксандравіч.***

*Загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1977 г. у Мінску. У 1999 г. закончыў гістарычны факультэт БДПУ імя Максіма Танка. Лаўрэат прэміі Мінгарвыканкама (2001 г.) і прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў "За асабісты ўклад у развіццё здольнасцяў таленавітай моладзі" (2005 г.). Аўтар каля 160 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку дапаможнікаў "Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII — пачатак XX ст.)" (Мн., 2005), "Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе" (Мн., 2010, 2011), "Выкарыстанне дакументальнага матэрыялу на ўроках гісторыі і грамадазнаўства" (у сааўт., Мн., 2012), "Уроки по учебному предмету "История Беларуси" в 6 классе" (Мн., 2014); "Уроки по учебному предмету "История Беларуси" в 8 классе" (Мн., 2014), "Гістарычнае краязнаўства Беларусі" (у сааўт., Гродна, 2014); вучэбна-метадычнага комплексу факультатыўных заняткаў "Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі: фарміраванне індустрыяльнага грамадства і нацыі (канец XVIII — пачатак XX ст.)" (у сааўт., Мн., 2010).*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ца суаднясеннем адпаведна яго прадметных і метадычных ведаў і ўменняў, з аднаго боку, і прафесійных пазіцый, псіхалагічных якасцяў — з другога. Расійскі дыдакт У.А.Адольф адзначае, што ***прафесійная кампетэнтнасць настаўніка*** — гэта комплекс ведаў, уменняў, уласцівасцяў і якасцяў асобы, якія забяспечваюць варыятыўнасць, аптымальнасць і эфектыўнасць вучэбна-выхаваўчага працэсу[1].

З вышэйсказанага становіцца зразумелым, чаму ўзнікае неабходнасць у фарміраванні даследчай дзейнасці педагога, накіраванай на пошук эфектыўных форм, метадаў, прыёмаў і сродкаў навучання і выхавання вучняў. Пад ***даследчай дзейнасцю педагогаў*** маецца на ўвазе іх індывідуальнае і (або) калектыўнае ўзаемадзеянне па даследаванні з'яў і фактаў адукацыйнага працэсу. Даследчая дзейнасць настаўніка можа лічыцца асноўным элементам і чыннікам педагагічнай творчасці ў сучаснай школе[2].

Можна сцвярджаць, што даследчая дзейнасць з'яўляецца *неад'емнай і неабходнай умовай* работы настаўніка: педагог павінен пастаянна параўноўваць эфектыўнасць розных метадаў, прыёмаў і сродкаў навучання і выхавання, шукаць іх найлепшыя варыянты, знаходзіць правільныя педагагічныя рашэнні ў пастаянна зменлівых і нестандартных вучэбных сітуацыях. У пошуках аптымальных рашэнняў ён выпрацоўвае стратэгію і тактыку ўласнай педагагічнай дзейнасці, праводзіць іх дыягностыку, ацэнку зробленага, карэктуе раней прынятыя рашэнні і шляхі іх рэалізацыі. Такім чынам, у паўсядзённай рабоце настаўніка прысутнічаюць амаль усе элементы даследчага пошуку.

Даследчая дзейнасць дапамагае самарэалізацыі педагога, росту яго кваліфікацыі, а таксама, што важна, атрыманню якасных новых ведаў аб прадмеце даследавання. Пры гэтым *прадметная накіраванасць* даследаванняў можа быць рознай. Гэта можа быць метадычны пошук у рамках праблем і задач, звязаных з вывучэннем асобнага вучэбнага прадмета; яно таксама можа ахопліваць агульныя праблемы выхавання і развіцця асобы ў адукацыйным працэсе; даследаванне можа насіць комплексны псіхолага-педагагічны характар, у якім вывучаюцца спосабы дыягностыкі і асобаснага развіцця навучэнцаў. *Вынікі даследчай дзейнасці* могуць быць як тэарэтычнымі (раскрыццё сутнасці вывучаемых з'яў, стварэнне навуковых класіфікацый, выяўленне заканамерных сувязяў педагагічных з'яў), так і практычнымі (навукова-метадычныя рэкамендацыі, вучэбныя праграмы, метадычныя распрацоўкі і г. д.).

Пры арганізацыі даследчай дзейнасці настаўнік, як правіла, можа сутыкацца з *шэрагам цяжкасцяў*, сярод якіх недастатковае валоданне метадалогіяй навуковага даследавання, недахоп навуковай псіхолага-педагагічнай і метадычнай літаратуры, адсутнасць часу, перавага ў традыцыйным навучанні рэпрадуктыўных метадаў, якія супярэчаць даследчым метадам і г. д. Таму для ***паспяховага ажыццяўлення даследчай дзейнасці*** ад педагога патрабуецца[3]:

— усведамленне яе характару як пошукавай, творчай, прадуктыўнай дзейнасці, накіраванай не проста на прыцягненне інфармацыі, а на яе стварэнне, на пошук арыгінальных і эфектыўных педагагічных рашэнняў;

— агульнанавуковая і прадметная эрудыраванасць, наяўнасць асобаснага творчага патэнцыялу, здольнасцяў да нестандартных падыходаў і рашэнняў; пэўных валявых і маральна-псіхалагічных якасцяў: настойлівасці, захаплення, крытычнасці і інш.;

— авалоданне метадалогіяй тэарэтычнага і практычнага навуковага пошуку, асноўнымі працэдурамі, методыкамі і алгарытмамі даследчай дзейнасці.

Разам з тым неабходна разумець, што стварыць жорсткія алгарытмы даследчага пошуку амаль немагчыма, бо карыстацца імі неабходна з улікам аб'екта і прадмета даследавання, спецыфікі адукацыйнай сітуацыі, асабістых магчымасцяў педагога. Прыкладная структура працэсу сацыяльна-педагагічнага даследавання была прапанаваная расійскім педагогам В.І.Загвязінскім[4] *(гл. табліцу на с. 44)*.

У сучасных адукацыйных умовах узнікла неабходнасць у тым, каб даследчая дзейнасць педагога стала мэтанакіравай і прафесіянальнай. Паказчыкам гатоўнасці педагога да яе ажыццяўлення з'яўляецца ***даследчая культура***, якая характарызуецца адзінствам трох складнікаў: інфармацыйнага — разуменне настаўнікам сутнасці даследчай дзейнасці; матывацыйнага — усведамленне яе ролі, месца і значэння ў педагагічным працэсе; і практычнага — сфарміраванасці ўменняў праводзіць педагагічнае даследаванне[5].

Уменні, неабходныя педагогу-даследчыку для паспяховай рэалізацыі пастаўленых задач, можна згрупаваць у наступныя блокі:

— *арганізацыйныя* (арганізацыя рабочага месца, планаванне сваёй работы);

— *уменні даследчага характару* (пастаноўка мэтаў даследавання, уменне пабудаваць яго структуру, валоданне метадамі даследавання і інш.);

— *уменні працаваць з інфармацыяй* (пошук, структураванне, сістэматызацыя інфармацыі і г. д.);

— *уменні прадставіць вынікі* сваёй работы (афармленне вынікаў, уменне выступаць з дакла-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дам, навуковым паведамленнем і г. д.).

З вышэйсказанага робіцца зразумелым, што неабходна мэтанакіраваная падрыхтоўка настаўніка да правядзення даследчай дзейнасці. Такая падрыхтоўка будзе эфектыўнай, калі яна:

— будзе накіраваная на фарміраванне ў настаўніка даследчай культуры, якая прадугледжвае наяўнасць матывацыі да ажыццяўлення даследчай дзейнасці, сістэмы ведаў аб яе правядзенні і валоданне спосабамі яе арганізацыі;

— уключае вывучэнне і аналіз узроўню падрыхтаванасці настаўніка да даследчай дзейнасці;

— забяспечвае падрыхтоўку да даследчай дзейнасці на матывацыйным, інфармацыйным і практычным узроўнях;

— прадугледжвае суб'ектную пазіцыю настаўніка ў працэсе даследчай дзейнасці і характарызуецца наяўнасцю ў вучэбным працэсе станоўчага эмацыянальнага клімату[6].

Пры гэтым важным з'яўляецца стварэнне *ўмоў, якія стымулююць педагогаў да даследчага пошуку.* Да ліку такіх умоў неабходна, у прыватнасці, аднесці:

— інфармаванне педагагічных кадраў па актуальных праблемах навучання і выхавання;

— арганізацыю сістэматычнай метадычнай работы як у самой установе адукацыі, так і ў іншых установах (арганізацыя сустрэч, навуковых семінараў, канферэнцый, пасяджэнняў круглага стала і г. д.);

— арганізацыйна-педагагічную падтрымку эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці педагогаў;

— прадастаўленне пэўнай свабоды выбару накірункаў даследаванняў, ступені ўдзелу і форм навукова-даследчай дзейнасці (работа ў складзе праблемных груп, творчых лабараторыях, у парах, індывідуальна і г. д.);

— знаёмства педагогаў з метадалогіяй навукова-педагагічнага даследавання;

— уключэнне педагогаў у сістэму інфармацыйнай навукова-метадычнай прасторы шляхам выкарыстання інфармацыйна-камп'ютарных тэхналогій;

— забеспячэнне галоснасці і аб'ектыўнай ацэнкі вынікаў навукова-даследчай работы педагогаў;

— наяўнасць эфектыўнай сістэмы маральнага і матэрыяльнага заахвочвання.

Такім чынам, ажыццяўленне даследчай работы дазваляе знайсці, праверыць або прапанаваць сваё, больш эфектыўнае, чым вядомае раней або агульнапрынятае, рашэнне пэўнай педагагічнай праблемы і выступае ў якасці неабходнай умовы дынамічнага развіцця адукацыйнага працэсу.

---

[1] Обучающие семинары: методическая поддержка компетентностного обучения / авт.-сост. Т. В. Хуртова. Волгоград, 2007. С.180.

[2] Загвязинский В.И., Атаханов Р. Методология и методы психолого-педагогического исследования: учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений. 5-е изд., испр. М., 2008. С. 4; Кручинина Е.Б. Подготовка учителя к исследовательской деятельности как фактор повышения педагогического мастерства: автореф. дис. ... канд. пед. наук: 13.00.08; Пензенский гос. пед. ун-т. Пенза, 2004. С. 3.

[3] Загвязинский В.И. Исследовательская деятельность педагога: учеб. пособие для высш. учеб. заведений. М., 2006. С. 7.

[4] Там жа. С. 8-9.

[5] Чикунова Г.К. Подготовка учителя к исследовательской деятельности в процессе повышения квалификации: автореф. дис. ... канд. пед. наук: 13.00.01; Акад. повышения квалификации и переподгот. работников образования М-ва образования Рос. Федерации. М., 2003. С. 20.

[6] Там жа. С. 5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ